УДК 821.161.3-31“19”

# АСАБЛІВАСЦІ НОВАЙ РЭАЛІСТЫЧНАЙ ПАРАДЫГМЫ Ў МАЛОЙ ПРОЗЕ У. СЦЯПАНА

**М. М. Воінава-Страха**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт замежных моў,*
*Мінск, Беларусь,* belphilology@gmail.com

У артыкуле разглядаюцца адметнасці рэалізму ў навелістыцы Уладзіміра Сцяпана. Выказваецца думка, што рэалістычная парадыгма ў малой прозе сучаснага беларускага пісьменніка вылучаецца выразнай аксіялагічнай скіраванасцю, тэндэнцыяй да асэнсавання сацыяльных і маральна-этычных аспектаў быцця сучасніка ў канкрэтных прасторава-часавых каардынатах праз зварот да шырокай палітры вобразна-выяўленчых сродкаў, якія дазваляюць максімальна дакладна перадаць дух, атмасферу і эмацыянальную танальнасць часу.

***Ключавыя словы:*** У. Сцяпан; малая проза; рэалізм; беларуская літаратура.

# ОСОБЕННОСТИ НОВОЙ РЕАЛИСТИЧЕСКОЙ ПАРАДИГМЫ В МАЛОЙ ПРОЗЕ В. СТЕПАНА

**М. М. Воинова-Стреха**

*Белорусский государственный университет иностранных языков,*
*Минск, Беларусь,* belphilology@gmail.com

В статье рассматриваются особенности реализма в малой прозе современного белорусского писателя Владимира Степана. Высказывается мысль о том, что реалистическая парадигма в новеллах автора отличается выразительной аксиологической направленностью, стремлением осмыслить социальные и нравственно-этические аспекты современной жизни в конкретных пространственно-временных координатах посредством использования широкой палитры образно-выразительных средств, позволяющих наиболее точно передать дух, атмосферу и эмоциональный тон времени.

***Ключевые слова:*** В. Степан; новелла; рассказ; реализм; белорусская литература.

# FEATURES OF THE NEW REALISTIC PARADIGM IN U. STYAPAN'S SHORT PROSE

**M. M. Voinava-Strakha**

*Belarusian State University of Foreign Languages,*
*Minsk, Belarus,* belphilology@gmail.com

The article examines the features of realism in Uladzimir Styapan's short stories. It is suggested that the realistic paradigm in the short prose of the modern Belarusian writer stands out for its clear axiological orientation, the tendency to comprehend the social and moral and ethical aspects of the existence of a contemporary in specific space-time coordinates through the appeal to a wide range of figurative means, allowing to convey the spirit, atmosphere and emotional tone of time as accurately as possible.

***Keywords:*** U. Styapan; short stories; realism; Belarusian literature.

Вектары развіцця беларускай літаратуры канца XX — пачатку XXI стагоддзяў адлюстроўваюць супярэчлівы дух часу мяжы стагоддзяў, дамінантнай адзнакай якога стала накіраванасць на перамены, пошук новых сэнсаў і формаў іх мастацкага ўвасаблення. Эксперыментальнасць на ўсіх узроўнях тэксту, накіраваная на ўзмацненне эфекту ўздзеяння на чытача, што часам пераўтваралася ў адкрыты эпатаж і мэтанакіраваны эксцэнтрызм, стала не толькі візітнай карткай цэлай плеяды айчынных мастакоў слова, але выразнай адзнакай літаратурнага працэсу дадзенага перыяду. Усе ўмовы, акалічнасці і праявы новай культурнай сітуацыі, здавалася б, павінны былі б прывесці да кардынальнай змены ідэйна-эстэтычнай сістэмы, якая працяглы час вызначала аблічча айчыннага прыгожага пісьменства. Трансфармацыя класічнай аксіясферы павінна была б стаць лагічным вынікам уплыву пазамастацкіх фактараў і іх шматлікіх праяў у творчай прасторы. Аднак нельга не згадзіцца са слушнымі вывадамі І. Шаўляковай-Барзенка, што “радыкальнай рэвізіі аксіясферы нацыянальнага мастацтва слова, наступствам якой была б замена аксіялагічных прыярытэтаў, не адбылося” [13, с. 454].

Тэндэнцыя да наватарства, цяга да адмысловай гульні са словам і неардынарных спосабаў яго прадстаўлення чытацкай аўдыторыі сведчыла (пры больш маштабным ракурсе) не столькі аб дасягненні адзінай мэты — катэгарычным адмаўленні ад здабыткаў мінулага, колькі пра пошукі ўласнага самавыражэння, сродкаў творчай самаідэнтыфікацыі. Вынікі такіх пошукаў не маглі не прывесці да абнаўлення мастацка-эстэтычнай сістэмы ў цэлым, аднак, яны не закранулі “ядровых, глыбінных асноў” аксіясферы беларускага мастацтва слова [13, с. 455]. Па сутнасці, айчыннае мастацтва слова засталося верным сабе ў рэчышчы арыентацыі на асэнсаванне сутнасных дамінантаў быцця чалавека, яго каштоўнасных арыенціраў, прычын трансфармацыі светапогляднай сістэмы і г.д.

Разам з тым, новыя павевы ў самых розных кірунках жыцця, якія прынесла XXI стагоддзе, не магло не паўплываць на аб’ект мастацкага асэнсавання. У цэнтры ўвагі пісьменнікаў апынуліся актуальныя рэаліі новага часу. Так, даследчыкі даўно сцвярджаюць надыход эпохі новага рэалізму, для якога ў адрозненні ад рэалізму XX стагоддзя ці

постмадэрновых пошукаў характэрна адлюстраванне змен каштоўнаснай парадыгмы сучаснага грамадства: імкненне да стабільнасці, значнасць базавых каштоўнасцяў у іх іерархіі, асэнсаванне сучаснасці і мінулага па-за ідэалагічнымі рамкамі, стомленасць ад “рэальнасці віртуальнага”; зварот да традыцыі, як класічнай, так і постмадэрнісцкай [2]. Як слушна адзначае даследчык М. С. Рагачэўская, “у рамках новай рэалістычнай парадыгмы актыўна развіваецца ўстаноўка на каштоўнасныя арыенціры, адыход ад „смерці аўтара“ і пераключэнне на „пазіцыю“ аўтара, якая, у адрозненне ад кантралюючага „ўсебачання“ і „ўсеведання“, настройвае чытацкую свядомасць на крытычнае пераасэнсаванне таго, што адлюстроўваецца, але з відавочным аксіялагічным складнікам. Сучасная літаратура заклікана вярнуць нас да адносін, соцыуму, этыкі, гуманізму і разуменню душы новага чалавека эпохі інфармацыйных тэхналогій” [1].

Вышэйакрэсленыя тэндэнцыі характэрны і для малой прозы сучаснага мастака слова У. Сцяпана (нар. 1958 г.). Сярод асаблівасцей яго індывідуальна-творчага стылю навукоўцы вылучаюць “выяўленчасць” пісьма, “калі маляванне (як працэс і мэта адначасова) становіцца сюжэтным грунтам („Мінскі альбом“) альбо аб’ектам мастацкай інтэрпрэтацыі” [14]. У дадзеным артыкуле скіруем увагу на некаторыя адметныя рысы рэалістычнай малой прозы пісьменніка.

Сярод тэм, якія ўздымае ў мастацкай прасторы У. Сцяпан, — перыпетыі быцця і выбару асобы ў сучасных рэаліях, шырокае кола праблем, якія закранаюць разнастайныя аспекты сямейных узаемаадносін, родавай пераемнаці, жыцця і смерці, вернасці маральным прынцыпам, фарміравання светапогляду ў падлеткаў, у тым ліку спазнанне імі дабра і зла, усведамленне спрадвечных універсальных і нацыянальных каштоўнасцей і многія іншыя. Не пазбягае ўвагі мастак слова і такіх актуальных тэм, як адаптацыя ў соцыуме людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Пісьменнік даволі далікатна раскрывае тыя цяжкасці, з якімі вымушана сутыкацца на жыццёвым шляху гэта частка грамадства. Аўтар дэманструе нежаданне і негатоўнасць акаляючага асяроддзя прыняць людзей з псіхічнымі захворваннямі ці фізічнымі “асаблівасцямі”, часам дэманструючы непрыхаваную пагарду ці нават адкрытую жорсткасць. Так, герою навелы “Я — Віця” дзеці адкрыта кідаюць у адказ “дэбіл”, а дарослыя выкарыстоўваюць як “дармавую дапамогу” падчас прыбірання кантэйнераў са смеццем. Вобраз гарбатага Барыскі (“Адна капейка”) выступае сродкам запалохвання дзяцей у выпадку іх непаслухмянства. У героя кідаюць каменнем, бо за што “яго любіць? Гарбаты, брудны, стары, бяззубы, апрануты ў рыззё, на нагах вялізныя ссохлыя чаравікі з адным матузком. А яшчэ і мех каля ног, лаплены-пералаплены” [5].

У малой прозе У. Сцяпана карціны паўсядзённага жыцця ў створанай ім мастацкай прасторы набываюць максімальна рэалістычныя абрысы дзякуючы павышанай увазе пісьменніка да дэталі. У вобразна-выяўленчай сістэме пісьменніка няма выпадковасцей. У навелістычным лаканізме, які вымагае сама прырода жанру, кожная дробязь набывае пэўную сэнсавую нагрузку. Так, пісьменнік быццам нязмушана згадвае, як каля ржавых кантэйнераў нетаропка прагульваюцца хіжыя каты, а аскетычны краявід і без таго цёмнай кватэры закрывае сцяна кааператыўнага дома, з прычыны чаго з-за акна "бачны невялікі кавалак вуліцы і кантэйнеры са смеццем" [10] ("Я — Віця"). Знешне непрыглядны малюнак з'яўляецца красамоўнай метафарай жыцця сям'і, якая апынулася ў цалкам безнадзейным становішчы.

Сюжэты навел У. Сцяпана ўпісаны ў канкрэтны сацыяльна-гістарычны кантэкст. Месца дзеяння ў творах мае рэальныя прасторавыя і часавыя каардынаты: сюжэт у навеле "Я — Віця" разгортваецца на вуліцы "Другая Авангардная", да сталяра Юзіка з просьбамі аб вырабе дамавін "нават з Гомеля прыязджалі", "на святы Юзік атрымліваў паштоўкі з Сургута" [10] ("Хімічны аловак"). Падзеі развіваюцца ў Мінску (цыкл "Альбом"), Касцюкоўцы (цыкл "Пра маму"), у мастацкай вучэльні імя Глебава, Верхнім горадзе, Беларускім вакзале ў Маскве, вуліцах Камсамольская, Купалаўская, Сухая, Бялінскага (цыкл "Альбом") і г.д., а героі надзелены не толькі імёнамі, але і мянушкамі: "Віктор" ("Шэры матылёк").

Эмацыянальная атмасфера твораў таксама набывае рэалістычную танальнасць праз адмысловую аўтарскую вобразна-выяўленчую сістэму, якая закранае розныя каналы ўспрыняцця інфармацыі. Пісьменнік уздзейнічае амаль на ўсе органы пачуццяў чытача, ствараючы насычана-яркія візуальныя і аўдыяльныя вобразы, перадае тонкія адценні паху, смаку, дотыку, што спрыяе часам дасягненню эфекту выразнай натуралістычнасці, напрыклад: "электрабрытва натужна гудзе" ("Я — Віця") [10], "металічны хрусткі гук напаўняе двухпакаёвую кватэру лёгкім вібрыруючым звонам" ("Гадзіннік за сцяной") [8]; "бухматыя цяжкія аблокі вісяць над іржавымі дахамі, над пыльнай зялянінай дрэў, над збялелым, злінялым ад сонечнага святла асфальтам" ("Шэры матылёк") [12]; "густое і цяжкае" паветра ("Я — Віця") [10], ад знаходак героя "сыходзіць кіслы і цяжкі смурод", "блытаюцца і хістаюцца скразняком тонкі пах парфумы, тупы пах клею і алейнай фарбы" ("Вонкавае святло") [7]; "цыгарэта была з медыцынскім прысмакам" ("Зімны лёс") [11]; "рукаў халата казыча твар" ("Вонкавае святло") [7] і многія іншыя.

Майстар дэталі, У. Сцяпан не пакідае без увагі і асаблівасці інтэр'ера. Так, у нічым непрыкметнай цырульні кідаюцца ў вочы "на ўсіх здымках

абыякава ветлыя твары і робленыя рэкламныя ўсмешкі» (“Вонкавае святло”) [7]. Вобраз сучаснай двухпакаёвай кватэры набывае рэалістычныя абрысы праз лаканічнае, але даволі красамоўнае апісанне кухні, у якой стаялі “два сталы, два шкапчыкі, дзве паліцы» [8], ці кубак, “у якога няма вушка” [8] (“Гадзіннік за сцяной”). Да дробязі дэталізаваны інтэр’ер дазваляе чытачу заняць пазіцыю не сузіральніка, а сапраўднага відавочцы падзей, стаць часткай карціны, убачыць, як “апрача сябе, падлогі, засланай шэрым лінолеумам, чатырох электрапліт, рукамыйнікаў і белых сталоў, у шкле адлюстроўваліся дзве лямпачкі і палова вялікага неахайнага шэрага валакна” [3, с. 3] (“Шчасце”); не абмінуць увагай белы вазон з альясам на шырокім падваконні, “паліцы з кнігамі, фотаздымкі за шклом, дробную пластыку: звяркі, рыбкі і компас” [3, с. 26] (“Снарад”); без скажонасці ўявіць, як “на шкліне засталася лінія, белая і роўная, як напятая, але крышку раскудлачаная нітка” [3, с. 5] (“Шчасце”).

На старонках малой прозы У. Сцяпана назіраецца своеасаблівае “зазямленне” звыкла ўзвышаных вобразаў. Так, казачная залатая рыбка ў яго мастацкай прасторы прадстаўляецца ў вобразе залацістага карася, якога псіхічна хворы герой навелы “Я — Віця” “выратоўвае ад патэльні”, утрымліваючы ў знойдзеным на сметніку акварыуме. Простая рэч, якая ўяўляла сапраўдную каштоўнасць для Віці, змагла толькі на кароткі час напоўніць сэнсам жыццё хворага трыццацігадовага мужчыны. Драматызм сітуацыі ўзмацняецца натуралістычнасцю дэталей: аўтар нібы неўзнарок паведамляе, як пасля нечаканай смерці рыбу, “якая пачала смярдзець” [10], маці “праз фортачку выкідвае ў бок сметніка. У цемры чуюцца хіжыя крокі катоў і злоснае каўканне” [10] (“Я — Віця”). Праз гэты трагічны для героя выпадак упершыню ў жыцці ён спрабуе асэнсаваць паняцце смерці.

Тыпізацыя герояў — яшчэ адна з характэрных рыс малой прозы пісьменніка. У. Сцяпан прадстаўляе цэлую галерэю персанажаў, у якіх лёгка распазнаюцца вобразы сучаснікаў: прадстаўнікі розных сацыяльных груп, прафесій, гарадскога і вясковага насельніцтва. Адметнасцю стылю пісьменніка з’яўляецца тое, што часта ён прама не ўказвае на сацыяльны статус сваіх герояў. Лёгкі намёк можна адчуць праз нязмушана згаданую дэталь, напрыклад, герой навелы “Швэдар” “здымаў старую выцертую куртку”, у якой разыходзілася “сапсаваная маланка” (“Швэдар”) [4]. У творы “Гадзіннік за сцяной” падчас апісання сцэны з хворай суседкай аўтар нібы незнарок згадвае мужчыну “ў пацёртым скураным плашчы”, а побач з ім — “вялікі зморшчаны партфель” [8].

Адной з асаблівасцей стылю У. Сцяпана з’яўляецца падкрэсленая функцыянальнасць і лаканічнасць мовы. Так, пісьменнік даволі актыўна выкарыстоўвае простыя двухсастаўныя (часта неразвітыя) ці

аднасастаўныя сказы розных відаў. Паказальным у дадзеным выпадку выступае дыялог паміж Грэтай і Максімам, героямі апавядання “Швэдар”, напрыклад: “Ты перабольшваеш, Грэта”, “Я недагаворваю”, “Кажы”, “Гэта немагчыма”, “Я разумею”, “Я магу быць побач”, “Я магу цябе везці” [4] і г.д. Аналагічныя асаблівасці сінтаксічных канструкцый уласцівы многім іншым навелам У. Сцяпана, у тым ліку са зборнікаў “Адна капейка” і “Хвалі”. Падобны мінімалізм лексічных сродкаў выконвае адначасова некалькі функцый: дазваляе пазбегнуць перагрувашчанасці тэксту, дасягнуць дынамізму дзеяння, спрыяе ўзмацненню цэльнасці і выразнасці выказвання і магчымасці засяродзіць увагу чытача на сутнасна важнай, галоўнай ідэі.

Лаканічнасць не перашкаджае аўтару перадаць тонкасці псіхалагічнай карціны твораў, напрыклад, праз зварот да жэстава-мімікавай мовы. Так, герой апавядання “Шэры матылёк” у перыяд асобаснага росквіту вылучаўся тым, што “моцна сціскаў далонь пры сустрэчы ці развітанні” [12]. У час разгубленасці і страты сэнсу жыцця “яго поціск вялы і слабы” [12]. З мэтай узмацнення псіхалагічнага ўражання, паглыблення ў атмасферу дзеяння У. Сцяпан даволі прадуктыўна ўжывае паўторы. Так, на старонках навелы “Швэдар” аўтар нязмушана засяроджваецца на тым, як падчас размовы са сваім абраннікам гераіня “рукой трымала крухмальнае крыло белай гардзіны”, а “звонку вертыкальнымі рыскамі беглі кроплі дажджу” [4]. Падчас узмацнення танальнасці іх дыялогу чытач ізноў не можа не ўлавіць, як “крухмальнае крыло гардзіны хіснулася і знерухомела”, як гераіня “павярнулася і пачала глядзець праз белую крухмальную гардзіну”, а “па чорным шкле беглі вертыкальнымі рыскамі кроплі дажджу” [4]. У момант кульмінацыі дыялогу гераіня акцэнтуе ўвагу на тым, што ў іх “розныя справы, розныя ўспаміны, рознае жыццё” [4]. Нельга не звярнуць увагу на апісанне вобразу дарогі, якая апынаецца ў фокусе ўвагі чытача пасля развітання Грэты і Максіма: “Дарога была ў калюгах… Дарога пачынала ўздымацца на мост. Над дарогай, крыху асветленай, адразу пачыналася чорнае неба. Яму здалося, што там, дзе дарога сутыкаецца з небам, — строма”. Гэтую ж ролю выконвае і ўжытая аўтарам анафара: “Ён ледзь уз’ехаў на мост… Ён націснуў на педалі… Ён разагнаў ровар…” [4].

Такім чынам, праведзены аналіз дазваляе адзначыць, што рэалістычная парадыгма ў малой прозе У. Сцяпана вылучаецца выразнай аксіялагічнай скіраванасцю, тэндэнцыяй да асэнсавання сацыяльных і маральна-этычных аспектаў быцця сучасніка ў канкрэтных прасторава-часавых каардынатах праз зварот да шырокай палітры вобразна-выяўленчых сродкаў, якія дазваляюць максімальна дакладна перадаць дух, атмасферу і эмацыянальную танальнасць часу.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Рогачевская М. С.* Английская литература XXI века и парадигма реализма // Материалы ежегодной научной конференции преподавателей и аспирантов университета, 17–27 апреля 2020 г. : в 5 ч. Минск : МГЛУ, 2020. Ч. 5. С. 102–104. URL: http://e-lib.mslu.by/handle/edoc/6051 (дата звароту : 20.09.2025).

2. *Семенова А. Л.* Русская литература от рубежа веков к рубежу веков: в поисках «нового реализма» // Ученые записки НОВГУ. 2022. №1 (40). С. 8–11. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/russkaya-literatura-ot-rubezha-vekov-k-rubezhu-vekov-v-poiskah-novogo-realizma (дата звароту : 28.09.2025).

3. *Сцяпан У. А.* Хвалі : аповесці і апавяданні. Мінск : Мастацкая літаратура, 2019.

4. *Сцяпан У. А.* Швэдар. URL: https://knihi.com/Uladzimir_Sciapan/Svedar.html (дата звароту : 24.09.2025).

5. *Сцяпан У. А.* Адна капейка. URL: https://ul-sciapan.livejournal.com/175380.html (дата звароту : 20.09.2025).

6. *Сцяпан У. А.* Браты. URL: https://knihi.com/Uladzimir_Sciapan/Braty.html (дата звароту : 20.09.2025).

7. *Сцяпан У. А.* Вонкавае святло. URL: https://knihi.com/Uladzimir_Sciapan/Vonkavaje_sviatlo.html (дата звароту : 20.09.2025).

8. *Сцяпан У. А.* Гадзіннік за сцяной. URL: https://knihi.com/Uladzimir_Sciapan/Hadzinnik_za_scianoj.html (дата звароту : 20.09.2025).

9. *Сцяпан У. А.* Хімічны аловак. URL: https://knihi.com/Uladzimir_Sciapan/Chimicny_alovak.html (дата звароту : 20.09.2025).

10. *Сцяпан У. А.* Я — Віця. URL: https://knihi.com/Uladzimir_Sciapan/Ja_-_Vicia.html (дата звароту : 20.09.2025).

11. *Сцяпан У. А.* Зімны лёс. URL: https://knihi.com/Uladzimir_Sciapan/Zimny_los.html (дата звароту : 20.09.2025).

12. *Сцяпан У. А.* Шэры матылёк. URL: https://knihi.com/Uladzimir_Sciapan/Sery_matylok.html (дата звароту : 20.09.2025).

13. *Шаўлякова-Барзенка І.* Аксіясфера беларускай літаратуры XXI стагоддзя : феномен скрыжавання дыялогаў // Национальные культуры в межкультурной коммуникации : сб. науч. ст. : в 2 ч. Минск : Колоград, 2016. Ч. 2. С. 454–461.

14. *Шаўлякова І.* Капэйка ў сутонні. Рэцэнзія на кнігу Уладзіміра Сцяпана Дзеяслоў. 2013. № 2 (63). С. 327–333.